**УДК 94(476)**

# ДЗЕЙНАСЦЬ АНТЫСАВЕЦКІХ УЗБРОЕНЫХ ФАРМІРАВАННЯЎ НА ТЭРЫТОРЫІ ПОЛАЦКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў САКАВІКУ – МАІ 1945 г.

***Г.А. МАШНЮК***
(***Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. А.І. КОРСАК***)

*У артыкуле на падставе архіўных дакументаў 964 фонду Занальнага дзяржаўнага архіва г. Полацка разгледжана дзейнасць узброеных антысавецкіх груповак, адлюстравана праца ўнутраных органаў улады Полацкай вобласці па барацьбе з бандытызмам вясной 1945 г.*

У жніўні 1944 г. была створана Полацкая вобласць, у якую ўваходзілі 15 раёнаў: Браслаўскі, Ветрынскі, Відзаўскі, Глыбоцкі, Дзісненскі, Докшыцкі, Дрысенскі, Міёрскі, Дунілавіцкі, Асвейскі, Плісаўскі, Полацкі, Расонскі, Ушацкі, Шаркаўшчынскі. Сацыяльна-палітычнае становішча ў заходніх раёнах Полацкай вобласці абумоўлена спецыфікай дадзенага рэгіёну. Знаходжанне заходніх раёнаў у складзе Польшчы (1921 – 1939 гг.), незавершаная саветызацыя Заходняй Беларусі, якую спыніла Вялікая Айчынная вайна. Несумненна гэтыя факты паўплывалі на дзеянні ў гэтым рэгіёне антысавецкага падполля [1, с. 253]. Ужо ў 1944 г. пасля вызвалення тэрыторыі Полацкай вобласці ад нацысцкай акупацыі было зафіксавана 50 нападаў на савецкіх актывістаў, напады на сельсаветы, кватэры актывістаў. У выніку гэтых дзеянняў было забіта 31 чалавекі 3 паранены. Улады ўскладалі правіну на дадзеныя выпадкі на дзеянні польскіх нацыяналістаў, прапаганду падчас нямецкай акупацыі і каталіцкіх святароў [2, с. 228; 3, с. 93].

Адным з фактараў, які ўплываў на дзейнасць антысавецкіх груп, было тое, што на тэрыторыі Полацкай вобласці пасля вызвалення ад нацысцкай акупацыі заставалася шмат зброі і боепрыпасаў. Так, у дакуменце ад 13 студзеня 1945 г. адзначалася, што пасля заканчэння баявых дзеянняў на тэрыторыі Полацкай вобласці засталося шмат зброі і ёй лёгка могуць авалодаць антысавецкія элементы [4, л. 33].

У спецданясенні ад 18 мая 1945 г. Генеральнаму пракурору БССР адзначалася павялічэнне актыўнасці бандыцкіх груп, у тым ліку і забойстваў савецкіх актывістаў. Так, 21 сакавіка 1945 г. бандытамі ў колькасці 3-х чалавек быў забіты старшыня калгасу імені Сталіна Верацееўскага сельсавету Плісаўскага раёну Цярэхаў Міхаіл Цімафеевіч.

У Шаркаўшчынскім раёне ў Каўшэлеўскім сельсавеце падчас падпіскі 4-га дзяржаўнага займу быў забіты бандытамі Зайцаў Парфен Андрэевіч. Забойства было зроблена на вуліцы і мела ідэялагічны характар, звязаны з сабатажам мерапрыемстваў савецкай улады [5, л. 30].

У Дзісненскім раёне Краснагорскім сельсавеце на хутары Барсукі вялікая ўзброеная група 25 красавіка 1945 г. у колькасці 22-х чалавек здзейсніла забойства ўпаўнаважанага раёнага аддзелу НКУС Людскага Феакціста Астапавіча і яго жонкі Вольгі Аляксандраўны. Забойства адбылося, калі Феакцíст Астапавіч быў разам з жонкай у гасцях у грамадзянкі Маркевіч, і пры выхадзе з яе дому было здзейснена забойства [5, л. 30].

У той жа дзень у Дзісненскім раёне ў Млынарскім сельсавеце бандытамі ў колькасці 4-х чалавек здейснілі няўдалы напад на Пучкоўскага Міхаіла Ігнацьевіча. У гэты час у яго кватэры знаходзіўся кіраўнік канторы заготскоту, кандыдат на ўступленне ў ВКП (б) Б Качэткоў. Бандыты прадставіліся польскімі нацыяналістамі і прапанавалі адчыніць дзверы. На гэты загад Пучкоўскі М.І. адмовіўся. Потым бандыты паспрабавалі ўвайсці ў кватэру з боку акна, аднак Качаткоў параніў аднаго бандыта ў руку, пасля гэтага група бандытаў скрылася разам з параненым. [5, л. 31].

У дакладной запісцы пракурору БССР ад 11 чэрвеня 1945 г. адзначалася, што на тэрыторыі некаторых раёнаў Полацкай вобласці адзначаецца павелічэнне антысавецкіх праяўленняў, а менавіта аграбленне крамаў, забойстваў і падпалаў [6, л. 54].

У Лужках Плісаўскі раён 12 мая 1945 г. бандытамі ў колькасці 3-х чалавек быў забіты ўчастковы раёнага аддзелу НКУС Кухта ў сябе на кватэры. 29 мая быў цяжка паранены ўчастковы ўпаўнаважаны раёнага аддзелу НКУС па Валодзькаўскаму сельсавету Плісаўскага раёну - Варданскі. Інцыдэнт адбыўся, калі пры правядзенні пошуку бандытаў на апушцы лесу адбылася перастрэлка [6, л. 54].

У справаздачы адзначаецца, што за май месяц павялічылася колькасць рабаванняў крамаў. У Плісаўскім раёне 28 мая 1945 г. была абрабавана крама Куркоўскага сельсавету. З крамы былі ўзяты такія рэчы, як гарэлка, соль і іншыя прадукты, бандыты зніклі ў невядомым накірунку. У вёсцы Парэчча Докшыцкага раёну група дэзерціраў у колькасці 8-мі чалавек здзейсніла напад на краму. Узламаўшы замок было забрана: 200 кг солі, 10 кг цукру, 3 кг масла, 200 драўляных лыжак і інш. Дэзертыры зніклі ў невядомым накірунку. 27 мая 1945 г. пасля падпалу Асінаўскага сельсавету бандытамі была абрабавана крама, з якой былі вынесены прадукты харчавання і віно [6, л. 54].

Можна адзначыць, што павелічэнне колькасці выпадкаў рабаванняў крамаў звязана з неабходнасцю ўзброеных аддзелаў у правіянце.

Адзначым тое, што пры складанні дакументаў не заўсёды поўна паказвалася нацыянальная прыналежнасць антысавецкіх груп. Вельмі часта іх запісвалі да ліку польскага падполля – Арміі Краёвай. Як адзначае Шумскі Я. для вызначэння прыналежнаці банды была нацыянальнасць яе кіраўніка [7, с. 52].

Пытанне з ліквідацыяй антысавецкіх банд у першыя пасляваенныя гады стаяла вельмі востра. Згодна з дакладамі Генеральнаму прокурору БССР, якія складаліся пасля дзеянняў антысавецкіх сіл, бандыты заставаліся не арыштаваныя і не знішчаныя. Гэта звязана з дрэннай укамплектаванасцю кадрамі ў раённых аддзелах заходніх раёнаў Полацкай вобласці. Так, у раённых аддзелах міліцыі ў Відзаўскім, Глыбоцкім, Браслаўскім – у апараце па барацьбе з бандытызмам працавала 2 чалавекі, у Шаркаўшчынскім, Плісаўскім, Мёрскім, Докшыцкім, Дунілавіцкім і Дзісненскім раёнах - усяго 1 чалавек у аддзеле па барацьбе з бандытызмам [1, с. 257-258].

Такім чынам, дзейнасць антысавецкага ўзброенага руху на тэрыторыі Полацкай вобласці пасля вызвалення ад нацыстаў, абумоўлена спецыфікай сацыяльна-палітычнага жыцця ў заходніх раёнах, якія не былі саветызаваны. Асноўнымі накірункамі ў дзейнасці ўзброеных груп былі наступныя: збіццё ці забойствы савецкіх актывістаў і супрацоўнікаў міліцыі, рабункі сельскіх крамаў, падпалы дзяржаўных установаў - сельсаветаў. Барацьба з антысавецкімі бандамі ў заходніх раёнах у першыя гады выклікала цяжкасці праз неукамплектаванасць кадрамі мясцовых органаў унутраных спраў.

ЛІТАРАТУРА

1. Савичев, В.Н. Очерки истории милиции Белорусской ССР 1917-1987 / В.Н. Савичев, А.Ф. Вишневский. – Минск: Беларусь, 1987. – 535 с.
2. Сумко, Е. Восстановление и развитие розничной торговли в Полоцкой области в первое послевоенное десятилетие / Е. Сумко // Гісторыя гандлю ў Беларусі (ад старажытнага часу да канца XX ст.): праблемы вывучэння і перспектывы даследавання : матэрыялы І Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 14–16 лістапада 2013 г.). — Мінск : Тэхналогія, 2014. - С. 228–238
3. Николаева, И.В. Повседневность населения Полотчины в послеаккупационный период Великой Отечественной войны / И.В. Николаева // Вестник полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. - 2014. -№ . - С. 90-94
4. Пред. Полоцкого исполкома. // ЗГА г. Полацка. – Ф. 964 (Прокуратура Полоцкой области). Оп. 2. Д. 5. Л. 33.
5. Прокурору Белорусской ССР – государственному советнику юстиции 2-го кл. Тов. Ветрову 18.5.1945 г. Спецдонесение // ЗГА г. Полацка. Ф. 964 (Прокуратура Полоцкой области). Оп. 2. Д. 2. Л. 30 - 31.
6. ПрокурoруБелорусской ССР государственному советникуюстиции 2-го кл. Тов. Ветрову И.Д. Докладная. // ЗГА г. Полацка. Ф. 964 (Прокуратура Полоцкой области). Оп. 1. Д. 5. Л. 54.
7. Шумскі, Я. Саветызацыя Заходняй Беларусі (1944 – 1953 г.) Прапаганда і адукацыя на службе ідэялогіі / Я. Шумскі. – Смаленск: Інбелкульт, 2014. - 326 с.